Зорын У.

# ІМЕМ ГЕРОЯ

Верасень 1943 года. Над акупіраваным гітлераўцамі Новарасійскам, над Цэмескай бухтай стаіць нязвыклая цішыня. Толькі сполахі асвятляльных ракет праціўніка папярэджваюць аб тым, што ён прытаіўся, урыўся ў зямлю і ў любы момант гатовы да бою. Падпалкоўнік Каданчык раз-пораз пазіраў на гадзіннік. Дэсантны атрад па першай жа, камандзе гатоў быў кінуцца на выкананне задання.

І раптам сотні гармат громам абудзілі наваколле. Пачалася артылерыйская падрыхтоўка перад, высадкай дэсанта. Вораг таксама адкрыў агонь. То там, то тут узнімаліся слупы вады ад разрываў снарадаў. Гітлераўцы імкнуліся пастаівіць заслон на шляху нашых дэсантнікаў. Але катэры на вялікай хуткасці ўварваліся ў бухту, з ходу пераадолелі марскія і сухапутныя перашкоды. Гэтым самым дэсантны атрад Каданчыка, адкрыў шлях у бухту і да берага.

Дэсантнікі падпалкоўніка Каданчыка аднaчасава з іншымі атрадамі высадзіліся на бераг ля прыстані Імпартная і электрастанцыіі. Перад імі была пастаўлена задача захапіць плацдарм на беразе ад усходняга молу да прыстані Старая Пасажырская, ударам з тылу прарваць фронт і знішчыць ворага ў раёне цэментнага завода "Пралетарый", пасёлка Адамава Балка і прыгарадзе Мефодзьеўскім.

Праціўнік вёў агонь з усіх сродкаў. Прасоўвацца было вельмі цяжка. Але задачу трэба было выканаць. Ад яе залежаў поспех агульнай аперацыі. І кожны воін разумеў гэта.

Падпалкоўнік Каданчык быў разам з байцамі, натхняў іх на подзвіг. Дэсантнікі дасягнулі электрастанцыі, выбіўшы на сваім шляху гітлеірeўцаіў з дамоў, што былі ператвораны ў доты, апорных пунктаў.

А 10 верасня праціўнік сцягнуў супраць палка Каданчыка вялікія сілы, аслабіўшы тым самым абарону на другіх участках. Становішча ўскладнілася яшчэ больш пасля таго, калі гітлераўцы адблі ў дэсантнікаў мол і пачалі мініраваць бераг бухты, каб не дапусціць прыбыцця падмацавання. Полк апынуўся амаль у акружэнні. Камандаванне накіравала іншыя палкі на важны апорны пункт гітлераўцаў – гару Сахарная Галава. Тут завязаліся вулічныя баі. Падаспела падмацаванне з суседняга палка. Вораг зноў быў адкінуты ад берага Полк Каданчыка ўтрымліваў свае пазіцыі да 14 верасня, ведучы бесперапынныя баі.

Атрымаўшы новы загад – прарваць кальцо варожай абароны і выйсці на злучэнне з суседнім асобым батальёнам марской пяхоты, падпалкоўнік Каданчык хутка расставіў сілы і пачаў атаку. Яна была настолькі імклівай, што вораг не вытрымаў націску. Яго абарона была прарвана.

Пасля злучэння з марской пяхотай трэба бьгло працягваць прасоўванне да цэнтра горада. Праціўнік пачаў канцэнтраваць сілы на шляху, рыхтуючыся да контратакі. Камандзір заўважыў гэта. Прадстаяў цяжкі бой. Што ж, і ён, падпалкоўнік Сяргей Мікалаевіч Каданчык, і байцы гатовы змагацца з ворагам за вызваленне горада Новарасійска да апошняга дыхання.Камандзір верыў у сілу духу сваіх байцоў, у іх беззапаветную вернасць Радзіме, а яны верылі ў свайго камандзіра, у кожнае яго слова.

Фашысты абрушылі на пазіцыі палка шквал артылерыйскага агню, разлічваючы спыніць наступленне дэсантнікаў. Снарады рвалі кожны метр зямлі.несціханы гул, чорныя хмары дыму і пылу ахуталі пазіцыю палка.камандзір аператыўна кіраваў боем, натхняючы полк на рашаючы штурм варожых умацаванняў.тут жа ён і загінуў.

Полк Каданчыка ўсё ж выканаў баявую задачу. У адзіным парыве ўзняліся афіцэры, сержанты і салдаты на ворага, змялі яго абарону, знішчаючы на сваім шляху фашысцкіх захопнікаў. 16 верасня горад Новарасійск быў вызвалены.

...Радасць перамогі змешвалася з горыччу страт воінаў і афіцрраў. Такі жорсткі і няўмольны закон вайны. Жыхары Новарасійска разам з ваеннымі аддалі даніну павагі і пашаны загінуўшым і пахавалі на плошчы горада, якая зараз носіць імя Герояў. Падпалкоўніку Сяргею Мікалаевічу Каданчыку пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

С. М. Каданчык – наш зямляк з вёскі Майсеевічы. Нарадзіўся ён 12 верасня 1906 года ў беднай сялянскай сям'і. З 1928 года Сяргей Мікалаевіч служыў у Чырвонай Арміі, у 1932 годзе закончыў аб'яднаныя курсы камандзіраў у Кіеве. Удзельнічаў у баявых дзеяннях пры вызваленні Заходняй Беларусі. У 1940 годзе на фінскім фронце быў прынят ў члены ВКП (б).

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны С. М. Каданчык у якасці камандзіра роты, затым палка змагаўся супраць фашысцкіх захопнікаў на Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Закаўказкім і Паўночна-Каўказкім франтах.

У новарасійску свята шануюць памяць героя. Яго імем названа адна з вуліц горада. Рыбалоўны траўлер таксама носіць яго імя.

**Зорын, У. Імем Героя / У. Зорын // Запаветы Леніна (Асіповічы). — 1978. — 2 лютага. — С. 2.**